## № 29. Ганьне Бабарэцы

*29/XI–1930 г.*

Дарагая і любая Анечка!

Яду і бялізну, што перадавала ты ў аўторак, атрымаў. Ня ведаю, як і дзякаваць за любоў, увагу і клопаты. Толькі ці не адбіраеце гэта вы ад сябе? Глядзі, дарагая і любая, нашых слаўных дзетак і сябе, каб хаця жывы былі і здаровы. Як Лорачка — ты нічога пра яе не напісала. Няхай мама памагае табе гадаваць і глядзець дзяцей. Калі трудна, едзьце ўсе ў вёску, — на мяне не глядзеце. Я здароў і вытрымалы.

Адсылаю брудную бялізну: кальсоны, сарочку, прасьціну, шкарпэткі, ручнікі, наўлачку, хусьціны, торбачку.

Я рад, што Лялячка падрасла і здаровенька. Моцна–моцна цалую вас усіх, цябе, любая, сваіх дарагіх і слаўных Лорачку і Лялячку, і маму.

Ваш *Адам*.

## № 30. Ганьне Бабарэцы

*2/XII–1930 г.*

Дарагая і любая Анечка!

Суботнюю перадачу атрымаў. Шчырае і вялікае дзякуй. Толькі глядзеце, ня крыўдзьце сябе. Цукру ня трэба. Глядзі, любая, каб было Лорачцы і Лялячцы.

Добра было–б, каб ты перадала, любая, мне, а гэта можна, нямецкія кнігі: 1) Рэмарка — „Im Westen nichts neues“ („На захадзе бяз зьмен“), 2) Немецко–русский словарь (малы), 3) Рабочую книгу па нямецкому языку II ч. і 4) Нямецкую граматыку.

Я здароў і не палю. Спатканьня прасіў. Глядзеце, любыя, нашых слаўных дзетак, каб жывы былі і здаровы.

Моцна–моцна цалую Вас усіх.

Ваш *Адам*.

## № 31. Ганьне Бабарэцы

*6 сьнежня 1930 г.*

Дарагая і любая Анечка!

Аўторкавую перадачу бялізны і яды атрымаў. Шчыра і моцна дзякую, любая. Я здароў, моцны і чысты.

## № 32. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*30/XII–1930 г.*

З Новым годам,
Дарагія мае, любыя мае, родныя мае!